**Фёдарава А.М.,**
аспірантка кафедры
бібліятэказнаўства

# ФОРМЫ І МЕТАДЫ РАБОТЫ БІБЛІЯТЭКІ ПА ЭСТЭТЫЧНЫМ ВЫХАВАННІ

Мастацкая культура грамадства — гэта сукупнасць мастацкіх каштоўнасцей, вопыту стварэння, захавання, распаўсюджвання і спажывання іх, г. зн. сукупнасць устойлівых спосабаў мастацкай дзейнасці (1, с.18). Мастацкая культура — спецыфічная частка больш аб'ёмнай эстэтычнай культуры. Нельга звязваць значэнне эстэтычнага выхавання толькі з дапамогай у арганізацыі вольнага часу або рэкамендацыяй адпаведнай літаратуры. Неабходна ўлічваць таксама і ўплыў літаратуры і мастацтва на духоўны патэнцыял асобы, развіваць здольнасці яе адчуваць, перажываць і пераўтвараць прыроду, грамадскае жыццё і самога чалавека па законах прыгажосці.

Бібліятэка займала і займае важнае месца ў сістэме эстэтычнага выхавання насельніцтва. Дзякуючы практыцы ў гэтым напрамку былі створаны традыцыйныя формы індывідуальнай, групавой і масавай работы. Дзеля дасягнення мэты эстэтычнага развіцця асобы бібліятэкі ў асноўным надавалі ўвагу прапагандзе лепшых твораў мастацкай літаратуры і мастацтва. Па-першае, гэта правядзенне шэрага мерапрыемстваў, прысвечаных канкрэтнай тэме: прапагандзе твораў літаратуры і мастацтва аб гісторыі краіны, краязнаўчай літаратуры, разгляду і паказу літаратурнай творчасці прадстаўнікоў сусветнай і айчыннай літаратуры, фарміраванню мастацкага густу, прапаганды літаратуры па розных відах мастацтва; па-другое, работа па аказанні бібліятэчнай дапамогі школам, дзіцячым садкам, прадстаўнікам радыёвяшчання, прэсы і іншых арганізацый у эстэтычным выхаванні, сумесным супрацоўніцтве з імі.



Репозиторий БГУКИ

У сваёй дзейнасці бібліятэкары выкарыстоўваюць розныя формы і метады. Гэта арганізацыя выставак, выставак-праглядаў з каментарыямі, канферэнцый па асобных творах і інш. Значнае месца ў рабоце бібліятэк займае комплексная прапаганда твораў літаратуры і мастацтва. Для таго каб раскрыць прыгажосць роднага краю, бібліятэкары шырока прапагандуюць літаратуру беларускіх пісьменнікаў, выкарыстоўваючы пры гэтым розныя формы і метады: месячнікі беларускай кнігі, экспрэс-выстаўкі, вечары-партрэты, конкурсы, знаёмствы з творчасцю землякоў, пачынаючых літаратуразнаўцаў. Арганізуюцца фальклорныя клубы па прапагандзе беларускай і краязнаўчай літаратуры, краязнаўчыя альманахі.

Сваёй работай бібліятэкары імкнуцца прыцягнуць да чытання беларускай літаратуры найбольшую колькасць чытачоў і зрабіць гэтае чытанне сістэматычным і мэтанакіраваным. Прапаганда літаратуры ўвязваецца з гісторыяй і культурай роднага краю.

У практыку работы бібліятэк увайшлі сустрэчы з работнікамі беларускіх выдавецтваў, супрацоўнікамі рэдакцый часопісаў і газет, літаратурнымі крытыкамі. Журналісты дзеляцца планамі з чытачамі, выслухоўваюць іх думкі, меркаванні аб сваёй рабоце і прапановы па яе ўдасканальванні. Такія сустрэчы ўзбагачаюць і чытачоў, і літаратурных работнікаў. Бібліятэкі шырока супрацоўнічаюць і з рознымі ўстановамі культуры, з краязнаўчымі музеямі, аб'яднаннямі кнігалюбаў і творчымі саюзамі.

Для фарміравання мастацкага густу ў дзяцей па жывапісе, музыцы, скульптуры ў бібліятэцы арганізуюцца кніжныя выставы, прысвечаныя розным відам мастацтва, афармляюцца куткі мастацтва, на базе якіх праводзяцца гутаркі, агляды літаратуры, чытанні. Акрамя твораў друку, у сваёй рабоце бібліятэкары выкарыстоўваюць і аўдыёвізуальныя матэрыялы.

Паспяховай прапагандзе кніг аб музыцы спрыяе арганізацыя музычных ранішнікаў, вусных часопісаў і вечароў, прысвечаных кампазітарам.

Рэпазіторый БГУКІ

Распаўсюджанне атрымалі такія формы работы, як музычная гадзіна, музычны чацвер, музычны тыдзень, музычная алімпіяда.

Для прапаганды кніг па выяўленчым мастацтве шырока выкарыстоўваюцца кніжныя ілюстрацыі: рэпрадукцыі кніг, дыяфільмы. У рабоце клуба актыўны ўдзел прымалі выкладчыкі музычных школ, настаўнікі і інш. Шырокае распаўсюджанне атрымала такая форма працы, як кіналекторый, прысвечаны розным відам мастацтва. Бібліятэкі працуюць у цесным кантакце з творчымі саюзамі і арганізацыямі: музеямі, саюзамі мастакоў, кампазітараў і пісьменнікаў, тэатрамі, кінатэатрамі, Дамамі народнай творчасці, аб'яднаннямі "Веды", кнігалюбаў і інш.

Шмат увагі ўдзяляецца развіццю творчых здольнасцей малодшага пакалення. У шэрагу бібліятэк арганізоўваюцца розныя клубы па інтарэсах, падтрымліваецца творчасць дзяцей. Выкарыстоўваючы розныя формы і метады прапаганды кнігі, бібліятэкары імкнуцца дапамагчы маладым чытачам зразумець змест кнігі, развіць іх чытацкія інтарэсы, сфарміраваць асобу.

Вялікую работу вядуць бібліятэкары па арганізацыі клубаў па інтарэсах. Арганізоўваюцца клубы аматараў мастацтва, паэзіі, мастацкага слова. Яны дапамагаюць выхоўваць у чытачоў глыбокую цікавасць да творчасці паэтаў, мастакоў, пісьменнікаў, мастацтвазнаўства і літаратуразнаўства, да гісторыі мастацтва, літаратуры. У іх рабоце прымаюць актыўны ўдзел супрацоўнікі музеяў, выкладчыкі музыкі, літаратуры, мастацтва. Бібліятэкары з'яўляюцца арганізатарамі і ўдзельнікамі пасяджэнняў, дапамагаюць вызначаць тэматыку заняткаў, праводзяць гутаркі, агляды кніг, арганізоўваюць выстаўкі, агляды, тэматычныя паліцы, выконваюць бібліяграфічныя даведкі, вывучаюць эстэтычныя запыты членаў клубаў.

У бібліятэках пачалі шырока выкарыстоўвацца і чытацка-глядацкія канферэнцыі, на якіх абмеркаванне той ці іншай мастацкай кнігі спалучаецца з экранізацыяй ці пастаноўкай твора, што значна пашырае эстэтычны

Рэпазіторый БГУКІ

кругагляд чытачоў, вучыць іх бачыць своеасаблівасць розных відаў мастацтва і спрыяе паляпшэнню эмацыянальнага ўспрымання.

Яшчэ адной комплекснай формай, якая шырока ўкаранілася ў практыку бібліятэк, сталі літаратурна-музычныя гасцёўні. Яны ўяўляюць аб'яднанні чытачоў, злучаных цікавасцю да літаратуры, розных відаў мастацтва. У час іх правядзення адбываецца ўзаемны абмен рознабаковай інфармацыяй.

Такім чынам, бібліятэкі Рэспублікі Беларусь набылі значны арсенал формаў і сродкаў у галіне эстэтычнага выхавання падрастаючага пакалення.

**Дубовік А.А.,**
аспірантка кафедры
бібліятэказнаўства

## ДА ПРАБЛЕМЫ ДЗІЦЯЧАГА НЕЧЫТАННЯ

Супярэчнасці і праблемы, якія за апошнія некалькі гадоў наспелі ў галінах дзіцячай літаратуры і чытання дзяцей, маюць патрэбу ў асэнсаванні іх на высокім навуковым узроўні.

Сітуацыя з чытаннем дзяцей выклікае агульную занепакоенасць, яна з'яўляецца састаўной часткай тых аб'ектыўных падзей, якія адбываюцца ў сучасным грамадстве. На прыметы крызісу дзіцячага чытання наслойваюцца яшчэ і характэрныя менавіта для нашага часу цяжкасці. Так, у пачатку 90-х гадоў расійскія сацыёлагі і навукоўцы канстатавалі факт наяўнасці такой з'явы, як сацыяльная дэпрывацыя — "недастатковасць, недахоп ці наогул пазбаўленне дзіцяці пэўных умоў, неабходных яму для нармальнай жыццядзейнасці і фізічнага, інтэлектуальнага, духоўнага развіцця". Тады ж пачалі гаварыць аб такой жахлівай з'яве нашай рэальнасці, як дэцэлерацыя, што значыць замаруджванне тэмпаў росту і развіцця дзяцей.



Репозиторий БГУКИ